Список используемых источников:

1. Алексеева, С. В. Тихомиров М. Н. как историк древнерусского города // М. Н. Тихомиров. Древнерусские города. СПб., 2008. – 350 с.

2. Гусева, С. В. (Алексеева) Город и горожане в княжеских усобицах второй четверти XV в. (Галич и Вятка): историографический аспект // Творческое наследие А. А. Зимина и современная российская историография: VI Зиминские чтения. М., 2017. – С. 41–72.

3. Дворниченко, А. Ю. Города-государства Древней Руси: старые истины, «новые подходы» и некоторые перспективы изучения // Палеоросия. Древняя Русь: во времени, в личностях, в идеях. – 2018. – № 2 (10). – С. 6–23.

4. Дворниченко, А. Ю. Зеркала и химеры. О возникновении древнерусского государства. СПб.: Евразия; М.: ИД Клио, 2017. – 560 с.

5. Дворниченко, А. Ю. Froynov legacy и главные задачи изучения Великого княжества Литовского, России и других стран Восточной Европы в средние века // Вестник Удмуртского университета. Сер. История и филология. – 2023. – Т. 33. –Вып. 1. – С. 7–20.

6. Кривошеев, Ю. В. Русская средневековая государственность. СПб., 2008. – 129 с.

7. Кривошеев, Ю. В. Русь и монголы: Исследование по истории Северо-Восточной Руси XII–XIV вв. 3-е изд. СПб., 2015. – 451 с.

8. Кривошеев, Ю. В., Соколов Р. А., Гусева С. В. Москва в эпоху средневековья: Очерки политической истории XII–XV столетий. СПб, 2021. – 432 с.

9. Фроянов, И. Я., Дворниченко, А. Ю. Города-государства Древней Руси. Л.: Издательство Ленинградского университета, 1988. – 269 с.

УДК 94(476)

# СОЙМАВЫЯ СТАЛІЦЫ Ў ВЯЛІКІМ КНЯСТВЕ ЛІТОЎСКІМ У КАНЦЫ XV – ДРУГОЙ ТРЭЦІ XVI СТАГОДДЗЯЎ

**Даўматовіч Кірыл Дзмітрыевіч, настаўнік гісторыі**
**ДУА «Сярэдняя школа № 5 г. Салігорска**
**імя Героя Савецкага Саюза В. І. Казлова»,**
**г. Салігорск, Рэспубліка Беларусь**

Ключавыя словы: соймавая сталіца; сойм; Вялікае Княства Літоўскае; парламентарызм; Вільня; Гародня; Берасце; Наваградак; Менск.

Рэферат. Мэта даследавання – вызначыць прычыны выбару месц для пасяджэнняў сойма ў Вялікім Княстве Літоўскім у канцы XV – другой трэці XVI стст. Прапануецца называць месца пасяджэнняў сойма – «соймавай сталіцай». Аўтар прыходзіць да высноваў, што галоўнай прычынай вабару соймавай сталіцы была прыдатнасць і зручнасць таго ці іншага месца ў пэўных умовах.

Да канца XV ст. у Вялікім Княстве Літоўскім (далей – ВКЛ) адбыліся істотныя сацыяльна-палітычныя змены. Новай з’явай у палітычным жыцці дзяржавы стала афармленне і развіццё прадстаўнічых інстытутаў улады [5, с. 21; 7, с. 1–33, 40–44, 70; 12, s. 139–140]. З гэтага часу і да заключэння Люблінскай уніі 1569 г. у ВКЛ дзейнічаў асобны парламетарны інстытут – сойм (вальны сойм), кампетэнцыя якога ўключала ўсе бакі дзяржаўна-палітычнага жыцця.

Перад пачаткам працы сойма Панамі-Радай сумесна з манархам па Вялікаму Княству расылаліся соймавыя лісты з запрашэннем да пасяджэння [1, № 100; 3, арк. 142–142 адв.; 4, арк. 537–538; 6, Дадатак, № 12, 31, 45, 53, 56, 60–61; 7, Приложение, с. 39–40]. У гэтых лістах вызначаліся месца і тэрмін пасяджэння, а таксама запрошаныя асобы (ці групы асобаў). Часам у соймавых лістах абгрунтоўвалася тое ці іншае месца пасяджэння сойма ВКЛ, якое мы ўмоўна называем «соймавай сталіцай». Менавіта праблеме прычын выбару таго ці іншага месца для пасяджэння сойма і прысвечана дадзенае паведамленне. З-за незахаванасці (і/або невядомасці) ўсіх крыніц, мы засяродзілі асноўную ўвагу толькі на асобных прыкладах.

Месца пасяджэнная сойма ВКЛ адыгрывала вельмі важную ролю ў палітычным жыцці грамадства. Гэта было звязана як з працэдурнымі момантамі працы парламента, так і з паўсядзёнымі праблемамі палітычнага народу ВКЛ. Трэба было сабраць акрамя Паноў-Рады прадстаўнікоў розных зямель Княства. Калі радныя паны амаль заўсёды былі забяспечаны фінансавымі сродкамі, то больш дробныя прадстаўнікі не заўсёды маглі забяспечыць сабе дарогу да месца пасяджэння сойма. У гэтым выпадку адметныя просьбы харунжых на Віленскім сойме 1559 г. Так, харунжыя прасілі Жыгімонта Аўгуста аб тым, каб мясцовая шляхта адпраўляла сваіх прадстаўнікоў на сойм і каб шляхта пакрывала кошт іх дарогі да месца пасяджэння. Харунжыя нават прасілі вызвалення ад срэбшчыны. Хаця манарх не вызваліў харунжых ад выканання іх прадстаўнічых і налогавых абавязкаў, але наконт аплаты шляху да месца пасяджэння сойма выказаўся станоўча («и тепер[ъ] водле постановенья соймового брати будете биръчое за працу свою») [11, с. 274–275]. У далейшым пытанне фінансафання соймавых паслоў падымалася на Гарадзенскім сойме 1567 г. [7, Дадатак, с. 176; 10, с. 16]. Акрамя эканамічнага фактару на выбар месца пасяджэння ўплывалі знешепалітычнае і ўнутранапалітычнае становішча ВКЛ, а таксама зручнасць таго ці іншага горада. Яшчэ з практыкі «спольнага» соймавання ВКЛ і Польшчы ў Гарадзельскім прывілеі 1413 г. након месц сумесных пасяджэнняў адзначалася: «ладзіць з’езды і соймы, калі будзе патрэба, у Люблінe ці ў Парчове ды і ў *іншых прыдатных месцах* [*вылучана намі – К. Д.*]» [9, с. 32].

Галоўным месцам соймавых пасяджэнняў у ВКЛ зразумела была сталіца дзяржавы – Вільня. «Сталічны» статус гэтага горада ў Княстве абгрунтаўваў палажэнне, чаму менавіта там павінны былі адбывацца найважнешыя падзеі. У Вільні на сойме 1492 г. наступным вялікім князем літоўскім быў абраны Аляксандр Казіміравіч [1, № 100; 3, арк. 142–142 адв.; 6, с. 134–137]. Нядзіўна чаму Жыгімонт Стары абраў Вільню як месца для выбрання свайго сына Жыгімонта Аўгуста наступным вялікім князем (1522) і ўзвядзення яго на пасаду (1529) [6, с. 230–231,

252]. Менавіта на Віленскіх соймах уводзілася агульнадзяржаўнае заканадаўства – Статуты ВКЛ 1529 і 1566 гг. [6, с. 252, 697–700].

Аднак акрамя Вільні соймавай сталіцай станавіліся і іншыя гарады. Напрыклад, у 1502 г. сойм быў у Наваградку, а ў 1507 г. – у Менску. Верагодна, на падобны выбар месца пасяджэння паўплавалі зборы войска ВКЛ ў дадзеных гарадах, калі дадаткова можна было вырашыць некаторыя пытанні [2, № 25; 6, с. 133; 7, Дадатак, с. 10]. Магчыма падобныя прычыны мелі месца і ў далейшым. Соймавымі сталіцамі ў Вялікім Княстве часта станавіліся такія памежныя з Польшчай гарады як Берасце і Гародня. Найчасцей дадзеныя памежныя гарады выбіраліся з нагоды пераездаў вялікіх князёў (якія адначасова былі і польскімі каралямі) паміж ВКЛ і Польскім каралеўствам. Ужо пры Аляксандры ў 1505 г. адбыўся Берасцейскі сойм [1, № 213; 6, с. 147–148; 8]. А у часы Жыгімонта Старога практыка па выбіранню Берасця і Гародні соймавымі сталіцамі стала рэгулярнай. Больш за тое памежныя соймавыя сталіцы дазвалялі манарху і палітычнаму народу больш інтэнсіўна распрацоўваць пытанні ўніі паміж ВКЛ і Польшчай. Напрыклад, у лісце Жыгімонта Аўгуста Бласлаўскаму і Вінніцкаму паветам ад 22 сакавіка 1566 г. наконт выбару Берасця як месца збору сойма адзначалася: «при границахъ съ паны радами и послами земль коруны Польское, которые на теперешний съемъ въ Люблине… зъ Беретья для постановеня скуточного въ справахъ, унеи сполной братской, одностайной милости, згоде належачихъ» [6, № 56, с. 166].

Былі выпадкі, калі на выбар соймавай сталіцы ўплывалі і іншыя фактары. Так, у лісце ад 20 кастрычніка 1565 г. «усім панам» Шчытовічам указвалася, што наступны сойм можа адбыцца як ў Вільне, так і ў Гародне. Было адзначана, што калі у Вільне не будзе эпідэміі («поветрие моровое»), тады сойм адбудзецца там [6, Дадатак, № 53, с. 154–155]. У выніку Віленскі сойм адбыўся.

Цікавая сітуацыя здарылася ў 1566 г. Тады 15 кастрычніка былі складзены соймавыя лісты, якія разаслалі 18 кастрычніка па Вялікаму Княству з запрашэннем на сойм у Берасці. Выбар дадзенага горада быў з нагоды знаходжання Жыгімонта Аўгуста ў Варшаве. Тым больш, што на гэтым сойме планавалася распрацоўваць пытанні ўніі з Польшчай [6, № 60, с. 178–182]. Аднак ужо 5 лістапада 1566 г. вялікім князем былі складзены новыя соймавыя лісты, ў якіх месца пасяджэння сойма пераносілася з Берасця ў Гародню. На перанос месца пасяджэння паўплывалі дзеянні Маскоўскай дзяржавы па ўмацаванню свайго ваенна-стратэгічнага становішча падчас Інфлянцкай вайны. Больш за тое планавалася правесці пасяджэнне ў Вільні, аднак з-за эпідэміялагічных абставінаў («за небезъпечностью поветрея») у горадзе, сойм вырашылі правесці ў Гародне. Пры гэтым прадугледжвалася, што калі падобная эпідэміялагічная сітуацыя (верагода, чума) будзе ў Гародне, то сойм перанясуць у Кнішын [6, № 61, с. 183–184]. У выніку сойм адбыўся ў Гародні.

Такім чынам, выбар соймавай сталіцы ў ВКЛ залежыў ад шэрага як унутраных, так і знешніх фактараў. Па-першае, месца пасяджэння залежала ад пытанняў, якія планаваліся ўзняць на сойме. Калі гэтыя пытанні закранaлі агульнадзяржаўныя інтарэсы (выбары наступнага манарха, ўхваленне агульнадзяржаўнага заканадаўства),

то сойм адбываўся ў сталічным горадзе Вялікага Княства – Вільні. Пры гэтым некаторыя пытанні (напрыклад, уніі) патрабавалі ад манарха хуткага пераезду паміж дзяржавамі, а часам узнікала патрэба ў сойма ВКЛ быць у кантакце з адсутным вялікім князем. У гэтых выпадках соймы праводзіліся ў памежных з Польшчай гарадах – Берасці або Гародні. Па-другое, месца пасяджэння залежала ад ваенна-палітычных акцый у першую чаргу, Маскоўскай дзяржавы. Па-трэцяе, некаторыя соймы маглі праводзіцца пры зручных абставінах, калі, напрыклад, усе станы сабраліся на ваенны збор, як гэта было у Навагрудку ці ў Менску. Па-чацвёртае, выбар соймавай сталіцы залежыў ад эпідэміялагічнай сітуацыі ў тым ці іншым горадзе. Падсумуючы, галоўным крытэрыем, які ўплываў на выбар соймавай сталіцы ў ВКЛ была прыдатнасць і зручнасць таго ці іншага месца ў пэўных умовах.

Спіс выкарыстаных крыніц:

1. Акты, относящиеся к истории Западной России : в 5 т. / Арх. комиссия, И. Григорович. – Санкт-Петербург: тип. II отделения Е. И. В. Канцелярии, 1846–1853. – Т. 1. – 1848. – 428 с.

2. Акты, относящиеся к истории Западной России : в 5 т. / Арх. комиссия, И. Григорович. – Санкт-Петербург: тип. II отделения Е. И. В. Канцелярии, 1846–1853. – Т. 2. – 1848. – 444 с.

3. Во имя Божее; как господар Его Милость Великий князь Александр сел на великом княжени Литовском Августа 1 дня, индикт 10, росказывалмя Его Милость листы судовыи и данину свою писати писарю своему Федку Янушковичу, и я што от того часу листов написал аж тыми разы, в тые книги новым вписываю // Национальный исторический архив Беларуси (НИАБ). – Ф. КМФ-18. Оп. 1. Д. 5.

4. Книга справ поселских, так теж данин и инших листов поточных за пановання Короля его милости Жикгимонта Старога // Национальный исторический архив Беларуси (НИАБ). – Ф. КМФ-18. Оп. 1. Д. 7.

5. Лойка, П. А. Шляхта беларускіх зямель у грамадска-палітычным жыцці Рэчы Паспалітай другой паловы XVI — першай трэці XVII ст. / П. А. Лойка. – Мінск : БДУ, 2002. – 98 с.

6. Любавский, М. К. Литовско-русский сейм: Опыт по истории учреждения в связи с внутренним строем и внешнею жизнью государства / М. К. Любавский. – Москва : Московский Университет, 1900. – 1160 с.

7. Максимейко, Н. А. Сеймы Литовско-русского государства до Люблинской унии 1569 г. / Н. А. Максимейко – Харьков : тип. Адольфа Дарре, 1902. – 205 с.

8. Полехов, С. В. Привилеи великих князей литовских Смоленской земли (середина XV – начало XVI в.) / С. В. Полехов // Studia Slavica et Balcanica Petropolitana. – 2015. – 1. – С. 115–140.

9. Помнікі права Беларусі XIV–XVI стст.: агульназемскія прывілеі і акты дзяржаўных уній / склад.: Г. Я. Галенчанка, А. А. Жлутка, А. А. Мяцельскі [і інш.]. – Мінск : БелНДІДАС, 2015. – 388 с.

10. Радаман, А. А. Ухвалы соймікаў і шляхецкіх з'ездаў Вялікага Княства

Літоўскага, Рускага і Жамойцкага ў сістэме нарматыўнага рэгулявання фінансавання соймавых паслоў у другой палове XVI – пачатку XVII ст. / А. А. Радаман // Весці БДПУ. – 2005. – № 4. Серыя 2. – С. 16–21.

11. Русская историческая библиотека : в XXXIX томах / Археографическая комиссия; И. Лаппо. – Юрьев: типография К. Маттисена, 1872–1927. – Т. XXX. – 1914. – 896 с.

12. Kutrzeba, S. Historya ustroju Polski w zarysie. Tom II: Litwa / S. Kutrzeba. – Lwów: nakł. Księgarni Polskiej Bernarda Połonieckiego ; Warszawa : Gebethner i Wolff, 1914. – 248 s.

УДК 930

## НЕКОТОРЫЕ ТРЕНДЫ НЕМЕЦКОЯЗЫЧНОЙ ИСТОРИОГРАФИИ И НАШИ ПРЕДСТАВЛЕНИЯ О ГОРОДЕ В ВКЛ

**Дворниченко Андрей Юрьевич, доктор исторических наук, профессор, заведующий кафедрой истории России с древнейших времён до XX века Санкт-Петербургский государственный университет (СПбГУ), г. Санкт-Петербург, Российская Федерация**

Ключевые слова: немецкоязычная историография, Великое княжество Литовское, город.

Реферат. Представления немецкоязычной историографии XX века автор старается соотнести с концепцией восточноевропейской науки и, прежде всего, с идеями той школы, к которой сам относится. Это идеи о древнерусском городе, как общинном центре волостного организма, о вече, как демократической форме управления и самоуправления в древнерусском обществе. Такой городской строй продолжал жить и в последующий «литовский» период, что нашло отражение и в западной исторической науке.

Историческая наука Германии[1] всегда живо интересовалась историей Великого княжества Литовского. Может, величина её вклада в изучение этой темы и пасует по сравнению с польской литуанистикой или с немецким же «пруссоведением», но этот дар немцев международной литуанистике (под ней понимаю изучение ВКЛ) надо оценить по достоинству. Как я уже пытался в своё время показать, немецкая историография в восприятии восточнославянского города неким парадоксальным образом оказалась в определенной зависимости от российской историографической

[1] Уверен, что стоит говорить даже не о немецкой в узком смысле слова, а о немецкоязычной историографии, также, как надо говорить, например, об англосаксонской.